Валерый Шаблюк

ДВОР У ТУГАНАВІЧАХ



Валерый Шаблюк

ДВОР У ТУГАНАВІЧАХ

МІНСК
"ПОЛЫМЯ"
1995

ББК 83.3 (4Беи) — 8 Міцкевіч
Ш13
УДК 882.6.09+929 Міцкевіч

Шаблюк В. У.
Ш 13 Двор у Туганавічах.— Мн.: Полымя, 1996.—48 с.: іл.
ISBN 985-07-0076-9.

Двор у Туганавічах (былы Навагрудскі павет), ва ўяўленні кожнага, хто захапляецца творчасцю А. Міцкевіча, непарыўна звязаны з імем паэта і з вобразам яго чароўнай музы — Марылі Верашчакі. У кнізе прасочваецца развіццё гэтага ўладання на працягу XV ст. — 30-ых гг. XX ст. Высвятляецца роля маёнтка і яго жыхароў у лёсе славутага паэта.

Разлічана на гісторыкаў, краязнаўцаў, літаратуразнаўцаў, усіх, хто зацікаўлены мінулым нашай Бацькаўшчыны.

Ш $\frac{8820600900-027}{М306(03)-95}$ 12—96

ISBN 985-07-0076-9

© В. У. Шаблюк, 1995

УСТУП

Ці даводзілася табе, шаноўны чытач, наведваць старыя, пакінутыя людзьмі селішчы? Парослыя бэзам пагоркі, дзе пад густой муравой хаваюцца падмуркі колішніх фальваркаў і засценкаў. Абкружаныя ліпавымі прысадамі старасвецкія двары, дзе нерухомая вада ставоў адлюстроўвае руіны былых палацаў. Калі так, то ты, напэўна, успомніш тую непаўторную ауру, што пануе ў гэтых мясцінах. Яна вымушае цябе, можа, упершыню ў жыцці, задумацца аб сваіх далёкіх продках, над мінулым сваёй зямлі, нарэшце, аб сваім месцы на ёй.

Колькі ж такіх пакінутых сялібаў раскідана па розных кутках Беларусі? Жыццё даўно пакінула гэтыя месцы, але яны засталіся існаваць у пісьмовых крыніцах, назвах урочышчаў, народных паданнях. А колькі вялікіх людзей упершыню ўбачылі свет у гэтых маленькіх паселішчах! У беларускіх дварах, фальварках, засценках нарадзіліся Т. Касцюшка, М.-К. Агінскі, А. Міцкевіч, В. Дунін-Марцінкевіч, С. Манюшка, У. Сыракомля, К. Каліноўскі, Я. Колас, Я. Купала і іншыя славутасці. Ураджэнец Навагрудчыны пісьменнік і фатограф Ян Булгак пісаў: «Кожны двор быў своеасаблівым светам, цэлым каралеўствам, але ягоны кароль быў адначасова і яго першым працаўніком, апранутым ва ўбранне заможнай сціпласці... Зямянін сядзеў на сваёй зямлі не таму, што так было зручна і выгадна, але таму, што так рабілі дзесяткі яго прадзедаў, што ён не ўмеў і не хацеў жыць інакш».

Аднаму з такіх куточкаў беларускай зямлі і прысвечана наша кніга.

Туганавічы... Месца вялікага кахання Адама

Міцкевіча. Менавіта тут паэт перажыў самыя шчаслівыя хвіліны свайго жыцця і тут жа развітаўся са сваім шчасцем.

Там, дзе страчаліся шчаснай парою,
Дзе расставаліся сумнай хвілінай,
Буду заўжды неразлучным з табою,
Бо ўсюды частку душы я пакінуў...

*А. Міцкевіч. «Да М*** (Марылі)».*
Пераклад М. Танка.

Сёння ад колішняй сядзібы захаваліся толькі векавыя дрэвы парка з ліпавай «альтанкай» Марылі, пакрытыя дрыгвой ставы, ды ледзь прыкметныя падмуркі асобных будынкаў. А зараз зазірнем у мінулае гэтай мясціны.


ПАЧАТКІ ГІСТОРЫІ

Я душою ў радзіме разліўся да скону,
Сам прыняў яе душу,
Край і я — неадлучны...

А. Міцкевіч. «Дзяды».
Пераклад М. Лужаніна

Былая сядзіба Туганавічы знаходзіцца ў самым цэнтры Навагрудскага ўзвышша, аднаго з найбольш маляўнічых куткоў нашай Бацькаўшчыны. Гэтая мясцовасць знаходзіцца на поўначы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці, на мяжы з Карэліцкім раёнам Гродзенскай вобласці. Прырода паклапацілася аб стварэнні тут добрых варункаў для жыцця людзей. Ураджайныя глебы. Спрыяльныя кліматычныя ўмовы. Хваёвыя і дубовыя пушчы са мноствам жывёл і птушак. Шматлікія рэчкі, што разбягаюцца адсюль па розных напрамках, а потым вяртаюцца да Нёмана. Раскошны кілім лугоў уздоўж рачных далінаў. Каралева беларускіх азёр Свіцязь са сваім непаўторным мікрасветам. У мінулым Навагрудскае ўзвышша было з усіх бакоў абкружана цяжкапраходнымі багнамі. Яны служылі ў якасці першага, створанага самой прыродай ахоўнага пояса для жыхароў гэтага своеасаблівага «вострава».

Людзі з'явіліся ў ваколіцах Туганавіч яшчэ ў IX—V тысячагоддзях да н. э. Адно з самых старажытных паселішчаў на тэрыторыі Беларусі выяўлена археолагамі на берагах возера Свіцязь. Яго адкрыў у 70-ыя гг. XIX ст. Ян Завіша. Даследчык дадзенага помніка Н. Гурына адносіць яго існаванне да эпохі верхняга палеаліту і мезаліту. Актыўнае асваенне Навагрудскага ўзвышша адбы-



Гарадзішча ля вёскі Сёгда (Карэліцкі раён). Фота Л. Калядзінскага



Курганы ля вёскі Скрышава (Карэліцкі раён). Фота Л. Калядзінскага

валася і ў наступныя гістарычныя эпохі — неаліце, бронзавым і раннім жалезным веку.

Па свайму этнічнаму складу ў I тысячагоддзі н. э. мясцовае насельніцтва належала да балцкіх плямёнаў. Пацверджаннем гэтаму служаць некаторыя гідронімы і тапонімы рэгіёна, што маюць выразнае балцкае паходжанне (Неўда, Сваротва, Сэрвач, Шчара, Аболішкі, Шантары, Яцвезь і інш.). У канцы I ст. н. э. з поўдня, усходу і паўночнага ўсходу ў Наваградскую зямлю пачынаюць пранікаць першыя групы ўсходнеславянскага насельніцтва (дрыгавічы, крывічы, часткова валыняне). Славянская каланізацыя асабліва павялічваецца на працягу XI—XIII стст. Апорнымі пунктамі рассялення славянскіх плямёнаў на балцкіх землях з'яўляліся ўмацаваныя паселішчы-гарадзішчы. Для гэтай мэты выкарыстоўваліся як даўнейшыя гарадзішчы саміх балтаў, так і новастварэныя. У радыусе некалькіх кіламетраў ад Туганавіч размяшчаюцца гарадзішчы каля вёсак Варонча, Застарынне, Пурневічы, Радагошча, Сёгда, гарадскога пасёлка Гарадзішча. Пра інтэнсіўнасць засялення рэгіёна ў XI—XIII стст. сведчаць таксама шматлікія курганныя могільнікі (возера Свіцязь, вёскі Грачыхі, Мондзіна, Плужыны, Саленікі, Скрышава). Да XIV ст. больш шматлікае і арганізаванае славянскае насельніцтва паступова асімілявала тутэйшых жыхароў-балтаў. Аднак балцкія ўплывы ў матэрыяльнай культуры, мове, народных звычаях яшчэ доўгі час захоўваліся на Наваградчыне. Нават у XIX ст. яе жыхароў можна было заўсёды пазнаць па іхняй своеасаблівай, мілагучнай мове.

У XIII ст. шчыльна заселеная і эканамічна развітая Наваградская зямля становіцца ядром фар-

міравання Вялікага княства Літоўскага. Ці не з гэтых часоў бярэ свой пачатак тая высокая нацыянальная і грамадзянская свядомасць, той патрыятызм, які ўвасобіўся ў наступныя стагоддзі ў постацях Тадэвуша Рэйтана, Самуэля Корсака, Адама Міцкевіча, Ігната Дамейкі, Яна Чачота, Уладзіслава Борзабагатага і іншых слынных ураджэнцаў Навагрудчыны.


ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

На старонках пісьмовых крыніц назва «Туганаўчы», «Туганава» ўпершыню з'яўляецца ў часы праўлення вялікага князя літоўскага Казіміра (1440—1492). 10 чэрвеня 1471 г. маршалак гаспадарскі Мікалай Няміравіч у тэстаменце запісаў сяло Туганаўчы (Туганава) сваёй жонцы Альжбеце, а пасля яе смерці — касцёлу ў Ішкалдзі пад юрысдыкцыю віленскага біскупа. Вядома, што перад Няміравічам уладальнікамі Туганавіч былі паны Юшка і Івашка Гойцавічы.

Іван (Івашка) Гойцавіч у 1452—1454 гг. з'яўляўся намеснікам віцебскім, а пазнейшыя звесткі пра яго адносяцца да 1455 і 1459 гг. Каму належала сяло да Гойцавічаў невядома, але назва паселішча мае, безумоўна, ўсходняе (татарскае) паходжанне ад імя Туган. Невыпадкова А. Міцкевіч выкарыстаў гэта імя для аднаго з персанажаў балады «Свіцязь». У гістарычнай і краязнаўчай літаратуры таксама неаднаразова падкрэслівалася, што першымі ўладальнікамі зямель у гэтай мясцовасці з'яўляліся князі Туганы. На карысць гэтага сведчаць і адзначаныя ў дакументах 1566 і 1570 гг. урочышчы Ардынка (Ардынцоўшчына),

Татароўшчына, а таксама «гай альховы за татарамі», што размяшчаліся паблізу Туганавіч.

Пасля смерці Мікалая Няміравіча (памёр каля 1489 г. — *В. Ш.*) Туганавічы сталі ўласнасцю вялікага князя літоўскага Казіміра. У 1510 г. яго сын Жыгімонт I выдае прывілей на сяло Туганавічы двараніну Сямёну Іванавічу. З гэтага прывілея вядома, што Сямён Іванавіч трапіў у палон у Маскву, дзе правёў дзевяць гадоў. Пасля вяртання з Масковіі ён просіць вялікага князя даць яму людзей сяла «на імя Туганавічы». Што ж нам вядома з пісьмовых крыніц пра гэтага чалавека? Высветлілася, што Сямён Іванавіч з'ўляўся выхадцам са знакамітага княжацкага роду Масальскіх, якія мелі свой уласны герб ад 1500 г. Упершыню ён згадваецца ў дакументах канца XV ст. у спісе смаленскіх князёў і баяр. У 1496 г. Сямён і Дзмітрый Іванавічы ўдзельнічаюць у судовай справе супраць свайго роднага брата Фёдара за права валодання маёнткамі іхняга дзядзькі Андрэя Сямёнавіча. Вядомы даследчык княжацкіх і шляхецкіх родаў Вялікага княства Літоўскага Юзаф Вольф лічыў, што Сямён і Дзмітрый неўзабаве эміграваліў Маскавію, дзе сталі заснавальнікамі роду князёў Клубковых-Масальскіх. Аднак меркаванні Вольфа, прынамсі ў дачыненні да Сямёна Іванавіча, з'яўляюцца памылковымі. Пасля палону, у які Сямён Іванавіч трапіў, верагодна, у 1500 г. падчас бітвы на рацэ Ведраша, ён вяртаецца ў Вялікае княства. Жыгімонт I дазваляе Сямёну Іванавічу стаць уладальнікам Туганавіч з усімі людзьмі і пустаўшчынамі навечна «...как держали Юшко и Ивашко Гоцевичи и пан Миколай Немирович и отец наш и мы». Паводле прывілею, Туганавічы не ўяўлялі сабой тады кампактнага паселішча, а складаліся з 14



Герб Туганоўскіх «Масальскі»

асобна размешчаных «службаў», у кожную з якіх мог уваходзіць адзін-два ці некалькі двароў.

Аднак Сямёну Іванавічу не давялося спакойна валодаць атрыманымі землямі. Хутка з прэтэнзіямі на іх выступілі наваградскія баяры Грынь і Еська Цяраевічы. У 1514 г. яны скардзяцца вялі-

каму князю на Сямёна Іванавіча, які «...отнимает нашу отчизну и не велит ее пахать, а мы вместе с боярами новгородскими служили боярскою службою, на войну ходили, а тую землю дал предкам нашим пан Ивашко Гоцевич...» У адказ на скаргу Сямён Іванавіч даводзіў, што ён атрымаў ад гаспадара (Жыгімонта I. — *В. Ш.*) зямлю ў Туганавічах навечна і паказваў ягоны прывілей. Цяраевічы ж даказвалі перад ваяводам навагародскім Янам Забярэзінскім (займаў гэтую пасаду з лютага 1509 г.), што яны мелі права на Туганавічы і таксама прадставілі прывілей за подпісам гаспадара (напэўна, Казіміра. — *В. Ш.*). Такім чынам, недзе ў другой палове XV ст. продкі Грыня і Еські атрымалі землі ў Туганавічах. Аднак у 1510 г. гэтая зямля з'яўлялася ўжо ўласнасцю вялікага князя Жыгімонта I, які і перадаў яе Сямёну Іванавічу. Узнікла канфліктная сітуацыя, калі абодва бакі мелі юрыдычнае права на адну і тую ж зямлю. У гэтых умовах Жыгімонт I прапануе наступны «кансэнсус». Ён дазваляе Цяраевічам узараць зямлю, сабраць з яе ўраджай жыта і ярыны і пакінуць яго на полі. Пасля гэтага суддзі ў прысутнасці Еські, Грыня і Сямёна Іванавіча павінны на месцы вырашыць пытанне аб уладальніку зямлі, які і стане гаспадаром зжатага збожжа. Справа ў рэшце рэшт вырашаецца на карысць Сямёна Іванавіча, бо 30 студзеня 1529 г. Жыгімонт I выдае яму яшчэ адзін прывілей на Туганавічы. З гэтага дакумента мы даведваемся аб некаторых новых фактах, што датычацца гісторыі ўладання Туганавіч. Высвятляецца, што маёнтак тут у свой час завяшчаў Сямёну Іванавічу ягоны бацька. Але калі Сямён Іванавіч трапіў у палон, гэта спадчына была ўзята дзяржавай («на скарб»). Такім чынам, ста-

новіцца зразумелым, чаму менавіта Сямёну Іванавічу Жыгімонт I пажалаваў Туганавічы пасля вяртання з палону. Адзначаны прывілей утрымлівае звесткі і пра тэрыторыю, што ўваходзіла ў склад тагачаснага двара: «...з людзьмі... у Прудах на імя Даіса Алішковіча, Кавалёў ці Скітэрычы, пустаўкі Ігнатоўшчына і Яўхімаўшчына ў Стрэльніках, пашня дворная і сенажаць Цэрквішча, каля яго людзей Туганавічы...» Акрамя гэтага, Сямёну Іванавічу была пажалавана «карчма вольная мядовая і піўная ў месцы Цырыне», поле варанецкае і дзве пустаўшчыны, якія надаў яго бацьку Ян Забярэзінскі (намеснік наваградскі ў 1496—1498 гг. — *В. Ш.*).

Згаданыя дакументы сведчаць, што ўжо ў першы перыяд існавання Туганавіч гэта ўладанне было ўласнасцю некалькіх родаў і, верагодна, не ўяўляла сабой адзінага цэлага.


У 1566 г. у маёнтку Туганавічы ў сувязі з правядзеннем у Вялікім княстве Літоўскім аграрнай рэформы адбыўся падзел зямлі (валочная памера). У гэты час двор належаў сынам Сямёна Іванавіча Міхаілу і Івану, якія ўжо насілі прозвішча Туганоўскіх. У склад маёнтка ўваходзілі пяць сёлаў: Маневічы, за якімі было замацавана 22 валокі[1] зямлі, Ясенец (26 валок), Стрэльнікі (9 валок), Рудашэвічы (9 валок 1 морг[2] 17 прутоў[3]), Пруды (8 валок 27 маргоў 20 прутоў). Туганавіч у гэтым спісе няма. Як вядома, згодна з «Уставай на валокі», прадугледжвалася ўзбуйненне сельскіх пасе-


[1] Валока = 30 маргоў = 21,36 га.

[2] Морг = 0,71 га = 7100 м^2.

[3] Прут = 23,7 м^2.

РАДАВОД ТУГАНОЎСКІХ ГЕРБУ «МАСАЛЬСКІ»




АДАМ
пам. пасля 1730
ЮЗАФ
пам. пасля 1730
МАРК
войскі наваградскі
ЯНА з ГАРАБУРДАЎ
ІГНАЦЫ
рэгент земскі
наваградскі
КАСПЕР
ТАДЭВУШ
пам. перад 1798
ЯН
1769 — каля 1847
старшыня наваградскага
земскага суда
СУЗАНА з АЎСЯНАЎ
ВІНЦЭНТ
1776 — паміж
1826—1832 суддзя
РАЗАЛІЯ са СТАЕВІЧАЎ
ІГНАЦЫ
1778 — пасля 1842
старшыня наваградскага
гродскага суда
ЮЗЭФА з ЯНОВІЧАЎ
КАНСТАНЦІН
1811—1864
губернскі сакратар
ЗОФ'Я з ВЕРАШЧАКАЎ
182?—1879
ЮЗАФ
1802—?
АНЭЛЯ
1812—?
ЮЛІЯ
1810—?
ЯДВІГА
1863—1881
КАНСТАНЦЫЯ
1859—1882
ЦЫВІНЬСКІ
МАРЫЯ
1861—?
ЮЗЭФА
1860—1930
ЗОСЯ
1879—1882

лішчаў. Паасобку размешчаныя двары пераносіліся ў адзін населены пункт. Відавочна, што ў перыяд паміж 1510—1566 гг. туганавіцкія службы таксама былі далучаны да аднаго з сёлаў уладання. Сярод іх тры сялы (Маневічы, Ясянец, Стрэльнікі) мелі кампактную забудову ў межах аднаго паселішча. А сёлы Рудашэвічы і Пруды, як раней Туганавічы, складаліся з сялянскіх і баярскіх гаспадарак (у Прудах, акрамя іх, яшчэ двор млынара), якія існавалі ў выглядзе асобных пасёлкаў. Сялянскія сядзібы («селішчы») у Прудах займалі плошчу ад 16 прутоў да 1 морга 5 прутоў. У сёлах, спланаваных паводле «Уставы на валокі», вясковыя двары мелі прыкладна аднолькавыя памеры. На землях, што апынуліся за межамі вясковых надзелаў, засноўваліся засценкі, якія арандавала дробная шляхта.

У выніку валочнай памеры абсалютная большасць гаспадароў у сёлах атрымала па адной валоцы зямлі. У сяле Рудашэвічы, якое ў асноўным засялялі баяры, памеры ворыўнай зямлі ў гаспадарках вагаліся ад 1 валокі 12 прутоў да 1 валокі 29 маргоў 7 прутоў, гэта значыць практычна да 2 валок. У сяле Пруды большая частка зямельных надзелаў мела памеры ў 25—26 маргоў.

У 1570 г. туганавіцкі маёнтак быў падзелены паміж Міхаілам і Іванам Туганоўскімі. У гэты час у Туганавічах існавалі два панскія двары. «Двор стары» ўзнік, напэўна, яшчэ ў другой палове XV ці ў пачатку XVI ст. Другі двор, каля якога, як адзначана ў дакуменце, дзейнічаў млын, сфарміраваўся на працягу першай паловы XVI ст. На гэтым месцы ён працягваў развівацца і ў наступныя стагоддзі. Яшчэ адзін падзел Туганавіч адбыўся ў 1595 г. паміж сынамі Івана — Андрэем, Станісла-


вам, Іванам (Янам) і Мікалаем. У выніку гэтых драбленняў у XVII ст. Туганавічы аказаліся падзеленымі на некалькі частак. Так, у 70-ыя гг. XVII ст. уладальнікамі маёнткаў і двароў у Туганавічах з'яўляліся Стэфан Данейка, Самуэль Туганоўскі, Казімір і Багуслаў Нарніцкія, Ян Касцянецкі, Аляксандр Камароўскі. У гэты час Туганавічы межаваліся з фальваркам Быковічы, які належаў кіеўскаму мітрапаліту Габрыэлю Календу. Гэтае суседства, мяркуючы па справе, што разглядалася ў Галоўным Літоўскім Трыбунале 20 чэрвеня 1673 г., не заўсёды было мірным. Уладальнікі Туганавіч скардзіліся на Г. Календу ў сувязі з гвалтоўным наездам яго падданых на сенажаць Даволеў Бераг, дзе 12 коп сена было спалена, частка скінута ў раку Сэрвач і 10 вазоў вывезена, а таксама на пабудову мітрапалітам млына на такім месцы, што ад гэтага затапіліся землі, дарогі і млын пана Туганоўскага. У сваю чаргу Г. Календа абвінавачваў Данейку, Туганоўскага і іншых у тым, што яны 9 траўня 1671 г. «...з не малою грамадою людей свавольных, челедей и подданых их милости, с стрельбою огнистою и иным розным оружьем, до бою належачим, чоловека до колько десять, трибом жолнерским, моцно кгвалтом... на млын жалуючих, на реце Сервечи будучий... найстье и наеханье и оного неслушне и неналежне кгвалтом ... зруиноване, посеченье, розкиданье и до щенту знесенье, спусту розкопанье, желез и иного начиня, до того млына належачого, также муки, збожа розного ... забранье и до домов своих запроваженье».

Паводле завяшчання Самуэля Туганоўскага ад 11 сакавіка 1682 г., маёнтак атрымалі ў спадчыну яго сыны Казімір, Ян, Павел і Габрыэль. У першай

траціне XVIII ст. Туганавічамі валодалі сын Паўла Самуэль і сыны апошняга Адам і Юзаф.

У пачатку XVIII ст. Самуэль і Зоф'я Туганоўскія заснавалі ў Туганавічах невялікую драўляную царкву святой Пракседы-мучаніцы, якая з'яўлялася філіяй Цырынскай царквы. У 1730 г. Адам і Юзаф прадаюць маёнтак свайму сваяку Станіславу Туганоўскаму. Сын Станіслава Казімір у сваю чаргу прадае Туганавічы ў 1755 г. ксяндзу Ігнацію Вішнеўскаму. Другая частка Туганавіч у першай палове XVIII ст. належала Трызнам і Азарычам. У сярэдзіне XVIII ст. уладальнікамі гэтай часткі двара становяцца Верашчакі.

Верашчакі гербу «Касцяша» былі старажытным баярскім родам, які паходзіў з Кобрынскай зямлі. Найбольш раннія звесткі пра іх датуюцца пачаткам XVI ст. У 1524 г. вялікі князь літоўскі Жыгімонт I выдае прывілей Богушу, Мішку, Стэцку, Івану і Сеньку Верашчакам на маёнтак Камень у Кобрынскім павеце навечна «за верную службу». Ад згаданага тут Сенькі (Сямёна) і выводзіцца род тых Верашчакаў, якія сталі ўладальнікамі Туганавіч. Сын Сямёна Іван пакінуў свае ўладанні ў спадчыну Івану і Канстанціну. Унук Канстанціна Філіп, скарбнік брэсцкі, купіў у 1706 г. у Міхаіла Булгака маёнтак Гутоўшчына ў Наваградскім павеце, які размяшчаўся непадалёку ад Туганавіч. У 1736 г. ён адпісаў гэты маёнтак свайму сыну Францішку, скарбніку брэсцкаму, а потым падчашаму наваградскаму. У 1758 г. Францішак набыў у Азарычаў за 39 тысяч злотых двор Туганавічы. Такім чынам, у другой палове XVIII ст. маёнтак Туганавічы складаўся з дзвюх частак. Адной з іх валодалі Вішнеўскія, а другой — Верашчакі. Вішнеўскім належалі сёлы





Герб Верашчакаў «Касцяша»

Туганавічы Падгайная, Пруды і частка (2 двары ў 1777 г.) Рудашоў (раней Рудашэвічы), а Верашчакам — Туганавічы Карчова, Стрэльнікі, Трацэвічы і большая частка Рудашоў (11 двароў у 1777 г.).

У 1778 г. Вішнеўскія прадаюць сваю частку маёнтка маршалку (раней падчашаму) навагрудскаму Антону Верашчаку, сыну Францішка. З гэтага часу Верашчакі, злучыўшы Туганавічы ў адно цэлае ўладанне, сталі яго адзінымі гаспадарамі.

РАДАВОД ВЕРАШЧАКАЎ ГЕРБУ «КАСЦЯША»




ЮЗЭФА ГРЫНЕЎСКІ
КАРАЛЬ 1785—?
ЯЦЭК 1791 — каля 1862
ВАЛЕРЫЯ ВЯРБОЎСКІ
ПАЎЛІНА МІХАІЛ АНЦУТА
ФЕЛІЦЫЯН 1787—?
АЎГУСЦІН 1790—?
ФРАНЦІШАК
ЭЛЕЎТЭРЫ 1795—?
ЗОФ'Я ВЯРЖБОЎСКІ
СТЭФАН 1840 — каля 1913
ФРАНЦІШКА з ГРАБОЎСКІХ
СТЭФАН-КАРАЛЬ 1871—?
МІХАЛ 1876—?
ЮЗАФ 1796—?
ЛЮДВІКА з РАЕЦКІХ
МІХАЛ 1795—1863
МАРЫЯ 1799—1863
ВАЎРЫНЕЦ ПУТКАМЕР 1794—1850
КАТАРЫНА перад 1795—?
КАЗІМІР 1831—?
ЗОФ'Я ?—1879
КАНСТАНЦІН ТУГАНОЎСКІ
ФРАНЦІШАК 1839—?
ЗОФ'Я 1825—1897
АНДРЭЙ КАЛІНОЎСКІ
СТАНІСЛАЎ 1828—1904
ФЕЛІЦЫЯ з КЕНЕВІЧАЎ
КАРАЛІНА 1839—1923
ЯН РЫХЛЕВІЧ
ЯДВІГА 1863—1881
КАНСТАНЦЫЯ 1859—1882
ЦЫВІНСКІ
МАРЫЯ 1861—?
ЮЗЭФА 1860—1930
ВАЎРЫНЕЦ 1859—1923
ЗОФ'Я з КЕНЕВІЧАЎ
ЗОСЯ 1879—1882
ЯНІНА 1889—1968
АДАМ ЖАЛТОЎСКІ

Паводле некаторых звестак, у другой палове 80-ых гг. XVIII ст. Туганавічы наведваў генерал, будучы начальнік паўстання 1794 г. Тадэвуш Касцюшка, які прыходзіўся далёкім сваяком Верашчакам.

Найбольш падрабязная інфармацыя пра колішнія сёлы Туганавіцкага маёнтка ўтрымліваецца ў інвентарах 1777 і 1778 гг. Гэтыя дадзеныя адносяцца перадусім да той часткі маёнтка, якая належала Вішнеўскім (Падгайная, Рудашы, Пруды). У сяле Падгайная ў 1777 г. налічвалася 26 двароў. Зямельныя надзелы былі роўныя 18,5 валокі. Пры гэтым 17 гаспадароў мелі паўвалокі зямлі, 8 гаспадароў — 1 валоку і 1 гаспадар — 2 валокі. Статак у сялянскіх гаспадарках складаўся з 22 коней і 46 валоў. Як бачым, асноўнай цяглавай сілай служылі валы. З 26 двароў толькі адзін заставаўся без рабочай жывёлы. У 1778 г. колькасць двароў у Падгайнай павялічваецца да 28. Рудашы у 1777 г. аб'ядноўвалі 13 двароў, а сяло Пруды, дзе ў той час жылі баяры,— 4 двары. З кожнай валокі зямлі мужчыны азначаных сёлаў былі павінны адрабляць па тры дні паншчыны на тыдзень на працягу ўсяго года, а жанчыны — зімой, вясной і восенню па чатыры дні на тыдзень, а з 16 ліпеня і да завяршэння збору ўраджаю з палёў і агародаў — па шэсць дзён. З паўвалокі зямлі паншчына для мужчын складала два дні на тыдзень увесь год, для жынчын зімой, вясной і восенню — два дні, а ўлетку — тры дні. З валокі зямлі на карысць двара трэба было прынесці каплуна, арэхі, грыбы і ягады на суму ў 4 злотыя, а з паўвалокі — 2 злотыя. Чынш з валокі плаціўся ў памеры 24 злотых, з паўвалокі — 12 злотых. Акрамя таго, падданыя зімой і летам выходзілі па чарзе на варту двара,

на шарваркі[1] па ўладкаванню грэбляў, а вясной і восенню пастаўлялі падводы для перавозкі зерня і прадуктаў. Тыя з сялян, хто мелі пчол, аддавалі ў двор палову сабранага мёду. Як сведчаць больш познія дакументы, Антон Верашчака палічыў такія павіннасці занадта цяжкімі і паменшыў іх.

У другой палове XVIII ст. на тэрыторыі маёнтка дзейнічалі два млыны: адзін на ставе ў сяле Рудашы, а другі — на рэчцы Сэрвач непадалёку ад двара. У 1775 г. у Туганавічах існавалі тры карчмы: у канцы сяла Падгайная на цырынскім гасцінцы (уязная), у сяле Карчова і каля дворнага млына.

Напрыканцы XVIII ст. межы Туганавіцкага маёнтка павялічваюцца за кошт далучаных да яго Антонам Верашчакай сяла Гарбатовічы і фальварка Плужыны з аднаіменным сялом. Паводле «рэвізкай сказкі» за 1795 г., у сяле Туганавічы Карчова налічвалася 38 двароў і 156 жыхароў, у Туганавічы Падгайная — адпаведна 30 і 126, у Рудашах — 13 і 53, у Трацэвічах — 2 і 7, у Гарбатовічах — 7 і 37, у Прудах — 2 і 6, у Плужынах — 5 і 31, у Стрэльніках — 2 і 9.

У самім двары акрамя сям'і яго гаспадара Антона Верашчакі жылі 24 чалавекі. Тут служылі шляхціцы Ян Кулакоўскі, Антон Грэгаровіч з жонкай Элеанорай, аканом Міхал Рыхтэр з жонкай Багумілай, сынамі Янам, Юзафам, дачкой Катарынай, плужынскі аканом Францішак Кравец, пані Катарына Тэраевічава, «вольныя людзі» Міхал Ляшчынскі, Антон Астроўскі, «пакаёвыя

[1] Павіннасць па будаўніцтву і рамонту дарог, мастоў, грэбляў, панскіх будынкаў.

дзеўкі» Настуся, Крыся, Зося, кухцік Якуб Гута, пастушкі Яська і яго брат Сымон, а таксама дваровыя слугі Каятан Календа з жонкай Настассяй, братамі Францішкам і Якубам, Дзімітры Селіман і «Фёдаравая ўдава».

А цяпер звернемся да апісання самога Туганавіцкага двара паводле інвентароў 1777 і 1778 гг. Дарога ў двор ішла з боку млына. Пры ўездзе размяшчалася падвойная брама. Вакол сядзібы быў узведзены паркан з дылаў (расколатыя ці распіленыя ўздоўж бярвенні). На дзядзінцы знаходзіліся дом упраўляючага (урадніка) з «белай ізбой», тынкаванай глінай, кафлянаю печчу з комінам, спіжаранькай[1] і прыбудаванай да будынка «каморай» для хатняй птушкі. Побач стаялі новыя сырніца, стайня з вазоўняй, двухпавярховы спіхлер[2] з двума свірнамі, два старыя свірны са склепамі, каморка для захоўвання агародных прыладаў. За гэтымі гаспадарчымі будынкамі размяшчаўся «агарод влоскі» (італьянскі.— *В. Ш.*), агароджаны парканам. У садзе мясцілася лядоўня.

Жылы сядзібны дом («рум») быў драўляны, двухпавярховы, пакрыты гонтай. Пры ўваходзе размяшчаўся ганак з чатырма лаўкамі, а далей — сені, адкуль па сходах можна было падняцца на другі паверх. Асноўную плошчу на першым паверсе займаў пакой на чатыры акны. Падлога ў ім была з тарціц (піленыя дошкі.— *В. Ш.*), а сцены

---

[1] Спіжарня — невялікі пакой у жылым памяшканні, дзе захоўваліся прадуктовыя запасы (мука, крупы, вяндліны і г. д.).

[2] Спіхлер, свіран — гаспадарчыя будынкі для захоўвання зерня, іншых сельскагаспадарчых прадуктаў і начыння.

«вымаляваны на паперы рознымі фарбамі». Тут стаяла печ з зялёнай кафлі на падмураванню і буфет ля дзвярэй. Па суседству змяшчаўся летні пакой на два акны з комінам, сцены яго таксама ўпрыгожвалі шпалеры. За гэтым пакоем існавала невялікае памяшканне («аптэчка»), з якога вялі дзверы на галерэю. На другім паверсе знаходзіліся маленькі кабінет (адно акно, столік, сцены «бела пафарбаваныя»), спальны пакой (два акны, печ «акруглай зялёнай кафлі на падмураванню», комін, тканыя шпалеры на сценах, столік квадратны «пад арэх маляваны», столік акруглы «для кавы», канапа блакітнага колеру, бакавы пакой (акно, столік, канапа «блакітна пафарбаваная», печ, комін) і яшчэ адно памяшканне (тры акны, невялікі буфет пры дзвярах).

За сядзібным домам размяшчаліся другі «вялікі» сад з сажалкай і разнастайныя гаспадарчыя будынкі: мураваная кухня з афіцынай, псярня, сушарня, бровар, абора з васьмю хлявамі, лазня, варыўня, кузня, саладоўня, дзве адрыны, тры стайні, мураваны склеп «для захоўвання гародніны», тры гумны. Непадалёку ад дома, на пагорку, стаяла новая драўляная капліца пад гонтай, з «баняй» (купалам) і двума крыжамі, а побач з ёй — званіца на трох слупах з двума званамі. Унутры капліцы знаходзіўся вялікі, прыгожа ўбраны тканінамі і кветкамі алтар з абразом Божай Маці. Яшчэ чатырнаццаць абразоў і тры карціны ўпрыгожвалі сцены капліцы. Рытуальнае (сакральнае) начынне было прадстаўлена двума драўлянымі ліхтарамі, Бібліяй і Евангеллем, алавяным келіхам, вялікім крыжом.

На беразе ракі, каля абсаджанай вербамі грэблі, круціў свае два колы новы млын пад гонтай. Тут

жа стаяла старая са свіранкам і саламянай страхой хата млынара і яшчэ адна хата з сенямі, у якой «шынкар як для шынка, так і для пілнавання млына жыве» і «шопка» (хлеў, пуня. — *В. Ш.*) з галля.

У спісе розных бытавых рэчаў, што выкарыстоўваліся ў гаспадарцы, адзначым шкляное і фаянсавае начынне, якое вельмі рэдка згадваецца пры апісанні двароў. Гэта «10 фарфур старых, і 12 новых, бутляў дужых 2, бутэлек чорнага шкла 7, карабінак (графінаў.— *В. Ш.*) для віна 6, ацтоўнічкаў (начынне для воцату.— *В. Ш.*) 2, 10 шклянак, кілішкаў 15, келіхаў 4.

З азначаных інвентароў вынікае, што маёнтак у Туганавічах меў даволі развітую гаспадарчую структуру. Пра гэта сведчыць, найперш, разнастайнасць і шматлікасць гаспадарчых пабудоў. У двары знаходзіліся практычна ўсе неабходныя для апрацоўкі і захоўвання сельскагаспадарчых прадуктаў памяшканні. Побач са старымі будынкамі, у дакументах называецца і дастатковая колькасць новых, што служыць доказам сталага развіцця эканомікі маёнтка. Галоўнай земляробчай культурай з'яўлялася жыта. У 1777 г. было засеяна 48 карцоў[1] азімага і 5 карцоў яравога жыта, у той час як аўса — 8 2/4 корца, ячменя — 7, яравой пшаніцы — 5, азімай — 1, гароха — 1/4 корца. Дваровы статак складаўся з бугая, кароў, цялушак, бычкоў, коней, авечак, бараноў. Належная ўвага ўдзялялася садаводству і агародніцтву. Са-

[1] Карэц — старадаўняя беларуская мера сыпкіх рэчываў, роўная прыблізна 102 л.

мыя неабходныя прылады працы (напрыклад, сашнікі) маглі вырабляцца ў мясцовай кузні.


У 1795 г. пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Туганавічы апынуліся ў межах іншай дзяржавы — Расійскай імперыі. Але ў Туганавічах, як і ў іншых дварах Навагрудскай зямлі, яшчэ жылі людзі, для якіх найдаражэйшай каштоўнасцю з'яўлялася воля. З думкамі пра яе яны і сустракалі новае, XIX стагоддзе.

У ЧАСЫ МІЦКЕВІЧА

У Туганавічах заўсёды шмат раю.

А. Міцкевіч, з ліста да Я. Чачота,
ліпень 1821 г.

У пачатку XIX ст. гаспадаром Туганавіцкага двара заставаўся Антон Верашчака. Побач з ім жылі яго другая жонка Францішка з Анцутаў і іх малыя дзеці — сыны Міхал, Юзаф і дачка Марыя, якую ахрысцілі якраз у першы дзень новага стагоддзя. Дом Верашчакаў, па трапнаму выразу іх сваяка, сусветна вядомага вучонага Ігната Дамейкі, быў «...адчынены для ўсяго павета». Тут наладжваліся дзелавыя і афіцыйныя сустрэчы, выезды на паляванне, балі. У 1806 г. Антон Верашчака памёр і ўладальнікамі Туганавіч сталі яго малалетнія сыны Міхал і Юзаф. Сапраўднай жа гаспадыняй двара з'яўлялася пані Францішка Верашчакавая. У маёнтак, як і ў канцы XVIII ст. уваходзіла сем сёлаў. Па рэвізіі 1811 г. у сяле Туганавічы Карчова было 38 двароў, у Туганавічах Падгайнай — 30, Рудашах — 13, Трацэвічах — 2, Гарбатовічах — 7, Плужынах — 5, Стрэльніках — 2.



Герб Міцкевічаў «Порай»

Пры Верашчаках у Туганавічах была заснавана новая царква — Узвіжання Крыжа з прытулкам для бедных, на мясцовых могілках існавала каталіцкая капліца.

У канцы 10-ых пачатку 20-ых гг. XIX ст. Туганавічы на час летніх вакацыяў сталі месцам сустрэч шматлікіх сяброў маладых Верашчакаў. Міхал, па ўспамінах сучаснікаў, быў высокім, атлетычнага складу чалавекам, і пры гэтым, вельмі



Адам Міцкевіч
(малюнак В. Ваньковіча, Вільня, 1823 г.)

сціплым у паводзінах. Любіў хадзіць пешшу. Часта наведваўся ў хаты сялян і цікавіўся іх жыццём, сямейнымі справамі. Грамадская дзейнасць і гаспадарка не выклікалі ў яго асаблівай увагі. Юзаф жа, наадварот, з задавальненнем займаўся гаспадаркай і актыўна ўдзельнічаў у павятовых сеймініках і іншых шляхецкіх сходах. У жніўні 1820 г. разам з «заўсёднікам» Туганавіч Тамашом Занам, які быў знаёмы з Міхалам і Юзафам яшчэ па гадах сумеснай вучобы ў Мінскай школе, сюды ўпершыню завітаў ягоны сябра і калега па Віленскаму універсітэту, пачынаючы паэт Адам Міцкевіч[1]. І прывяло яго ў Туганавічы не столькі знаёмства з маладымі гаспадарамі двара, колькі ўзнёслыя словы Томаша Зана пра іхнюю сястру Марыю. І хіба можна лічыць выпадковым, што сябры, паводле ўспамінаў Зана, прыехалі ў Туганавічы менавіта ў дзень імянінаў Марыі — 15 жніўня?

Якімі ж убачыў Адам Туганавічы? Краявіды тагачаснага маёнтка і ваколіц яскрава адлюстраваў яшчэ адзін сябра Міцкевіча, Ігнат Дамейка: «Туганавічы, даўні маёнтак Верашчакаў, ляжыць у самай прыгожай частцы Наваградскага павета, сядзібы Рэйтанаў, Белапятровічаў, Радзівілаў, Валадковічаў і многіх другіх заслужаных родаў краю... шырокія, зялёныя лугі, выганы, сенажаці, праз якія колькі вокам акінеш, уюцца серабрыстыя рэкі і ручаі, уздоўж берагоў каторых цягнуцца

[1] У літаратуры, прысвечанай А. Міцкевічу, выказваюцца розныя меркаванні адносна даты прыезду паэта ў Туганавічы. Усе аднадушныя ў тым, што гэта адбылося ў жніўні. А вось гады называюцца розныя — 1818, 1819, 1820. Найбольш аргументаваныя доказы наконт даціроўкі гэтай падзеі жніўнем 1820 г., змешчаны ў «Хроніцы жыцця і творчасці Міцкевіча».



Засценак Далматоўшчына на Наваградчыне (фота канца XIX ст.)

доўгія вёскі і засценкі... Ад кожнай вёскі спускаюцца да сенажацяў сельскія агароды, зацянёныя вішнёвымі дрэвамі, а над вёскай узвышаюцца апрацаваныя палеткі, жоўтыя, палевыя, зялёныя, што змяняюць сваю афарбоўку згодна пары года. Побач убачыш касцёл на ўзгорку, карчму, вятрак і двор шляхецкі з ліпавымі алеямі і абсаджаную таполямі дарогу. У гэтай жа частцы Навагрудскага павета часта сустрэнеш пры гасцінцах сляды старажытных курганоў, рэшткі заросшых дзірваном акопаў і ўмацаванняў: нямыя сведкі мінулых, неспакойных стагоддзяў. У такіх вось маляўнічых ваколіцах ляжыць двор Туганавіцкі, прасторна забудаваны, з мураванай, узнёслай над ім афіцынай і касцёлам. Вялікі ліпавы парк і сад з пладовых дрэў, мноства гаспадарчых пабудоў для чэлядзі, прыслугі, упраўляючых, надаюць гэтаму двару характар рэзідэнцыі нашай заможнай шляхты».

Але непаўторная прыгажосць Марыі (Марылі, як яе называў Міцкевіч) засланіла ў вачах маладога паэта харство прыроды. Знаёмы сям'і Верашчакаў Отта Слізень пісаў: «Марыя, хаця і не магла называцца прыгожай, мела рысы твару поўныя зачаравання і ў вачах красамоўны позірк дабрыні і пачуццёвасці. Як у размове, так і ўсімі сваімі паводзінамі, была яна сімпатычная; умеркавана вясёлая, ці ў ажыўленні, ці ў меланхалічнай задуменнасці, заўсёды цікавая і прывабная». Дамейка ўспамінаў: «Яна не была прыгожай у тым значэнні слова, якое звычайна прыдаюць яму людзі: невысокая, з акруглым тварам, вялікімі блакітнымі вачыма і светлымі валасамі, мела незвычайную прывабнасць у вуснах і поглядзе... Яе прыгажосць была не ў форме, але ў душы». Паэту імпанавала і тое, што Марыля была адукаванай жанчынай. Яна добра




Марыля Верашчака
(работа К. Мардасевіча паводле сучаснай мініяцюры)

ведала французскую, нямецкую і італьянскую мовы, сучасную літаратуру, сама пісала вершы, іграла на фартэпіяна і спрабавала ствараць п'есы, прыгожа спявала, асабліва беларускія песні.

Пэндзлем імя сваё ўславіць, хто хоча,
Піша з яе хай партрэты,
Рыфмай бяссмертнай звініце ахвоча,
Слаўце Марылю, паэты...

(А. Міцкевіч. «Сябрам». Пераклад А. Зарыцкага)


Успаміны пра Туганавічы і сваё першае каханне не пакідалі Міцкевіча ўсё жыццё. Пазней ён пісаў: «Можа Бог не дасць больш такога жыцця, але мы мусіць што-небудзь зрабіць, каб захаваць гэтае народнае зерне і даць адчуць усю яго каштоўнасць. Мне давялося шчодра пазнаць такое жыццё, асабліва ў доме Верашчакаў (Туганавічы, Плужыны), куды ў кампаніі Тамаша Зана і іншых мы прыязджалі на вакацыі. Цэлыя ночы ў лясах, над азёрамі». Прырода і людзі Туганавіч займаюць значнае месца ў творах паэта. Ён захаваў у сваёй памяці маляўнічыя бярозавыя гаі і векавыя дубровы, своеаблічныя навагрудскія засценкі і аколіцы, драўляныя каплічкі на вясковых могілках, старасвецкія корчмы пры гасцінцах, паданні мясцовага люду і імёны, імёны, імёны. Міхал Верашчака, якому Міцкевіч прысвяціў баладу «Свіцязь», добра ведаў гісторыю свайго роднага краю і мог гадзінамі распавядаць пра радаводы мясцовай шляхты. На сценах ягонага пакою вісела старажытная зброя і даспехі, якія нагадвалі пра колішнія бітвы і перамогі. У Туганавічах і суседніх з імі дварах, фальварках і засценках паэт сустракаўся з жывымі яшчэ сведкамі «эпохі Рэйтана і



«Мураванка Адама Міцкевіча» ў Туганавічах


Касцюшкі». Шмат цікавага Адам мог пачуць ад старога Стэфана Верашчакі, падкаморага наваградскага ў 1799—1812 гг., роднага дзядзькі Міхала, Юзэфа і Марылі. Таму невыпадкова, што творы А. Міцкевіча, а найперш паэма «Пан Тадэвуш» так насычаны гістарычнымі падзеямі, мясцінамі, імёнамі. У часы наведвання туганавіцкіх ваколіц, у паэта ўзнікла і задума паэмы «Дзяды». Вядома, што абрад Дзядоў ён назіраў ля могільнікавай каплічкі, якая стаяла на лясістым пагорку паміж вёскамі Трацэвічы і Мітрапольшчына.

Ролі Туганавіч у творчасці Адама Міцкевіча прысвечана ўжо шмат старонак у даследаваннях літаратуразнаўцаў, гісторыкаў, краязнаўцаў. Асабліва важнае месца ў гэтых працах займае пытанне аб ідэнтыфікацыі Сапліцава — сядзібы Суддзі ў паэме «Пан Тадэвуш». На гэтую ролю ў розныя часы «прэтэндавалі» многія двары і засценкі Навагрудчыны (Ваўкавічы, Сапліцы, Чамброва, Гарадзілаўка і г. д.). На думку некаторых даследчыкаў (С. Пігонь, В. Баровы, Я. Мілер), Сапліцава з'яўлялася як бы сінтэтычнай мясцовасцю, каторая ўвасобіла ў сябе рысы розных двароў і фальваркаў Навагрудскай зямлі. Аднак нам здаюцца больш слушнымі меркаванні Л. Падгорскага-Аколава. Ён задаваў пытанне: якую яшчэ мясціну паэт мог так часта ўспамінаць на чужыне, калі не тую, дзе перажыў адначасова і самае вялікае шчасце і найвялікшую роспач? І сам адказваў на яго: Туганавічы. Акрамя гэтага, несумненна істотнага псіхалагічнага моманту, трэба ўлічваць і шэраг супадаючых тапаграфічных прыкметаў у паэтычным Сапліцаве і рэчаісных Туганавічах (рэчка, два ставы, млын, касцёл-капліца са званіцай). Безумоўна, што ў сваім літаратурным творы Міцкевіч



«Дом Марылі» ў Туганавічах

мог выкарыстаць і жывыя ўражанні ад наведвання іншых двароў Навагрудчыны. У выніку гэтага на старонках «Пана Тадэвуша» побач з Сапліцавам з'яўляецца стары замак, якога на самой справе не было ў Туганавічах. Руіны замкаў ці гарадзішчы паэт мог назіраць у такіх мясцінах Навагрудскай зямлі як Рутка (Радагошча), Варонча, Гарадзечна, Пачапава і іншых. Пры апісанні замка ў Сапліцаве аўтар «Пана Тадэвуша» не мог не прыгадаць і велічнага Мірскага замка. Але асноўны матэрыял для сваёй паэмы Адам Міцкевіч відавочна сабраў падчас знаходжання ў Туганавічах. Паэт, як і іншыя госці Верашчакаў жыў у так званай мураванцы, альбо афіцыне, на сценах якога доўгія гады захоўваліся своеасаблівыя аўтографы — малюнкі і надпісы — многіх знакамітых людзей. Акрамя Міцкевіча і яго сяброў, тут у розныя часы спыняліся вядомы вучоны Бенедыкт Дыбоўскі, гісторык Тадэвуш Корзан, мастак Напалеон Орда, пісьменніцы Эліза Ажэшка, Марыя Канапніцкая. Сядзібны дом уяўляў сабой аднапавярховы мураваны будынак з мансардай і тэрасай на чатырох калонах. Унутраную планіроўку ўтваралі сені, якія традыцыйна размяшчаліся пасярэдзіне, направа ад ўвахода ішлі зала, салон і гасціная, налева — пакой з кабінетам. У вуглавым левым пакойчыку, пад вокнамі якога рос каштан («пакой пад каштанам»), жыла Марыля. Па паданню, месцам сустрэч Адама і яго сяброў-аднадумцаў з'яўляўся вялізны валун, што ляжаў у лясной лагчыне непадалёку ад двара. Ён меў даўжыню каля 4 м, вышыню ў 3 м і шырыню каля 2 м. У гады вучобы ў Віленскім універсітэце (1817—1823) А. Міцкевіч, Т. Зан, Я. Чачот, І. Дамейка і іншыя іх сябры і калегі — ураджэнцы Навагрудчыны ўваходзілі ў тайныя та-



«Камень філарэтаў» (фота канца XIX ст.)

варыствы філаматаў і філарэтаў, што прапаведавалі ідэі асветніцтва. Таму за валуном, частка якога захавалася да нашых дзён і замацавалася назва «камень філарэтаў». Ці не гэта мясціна апісана ў паэме «Пан Тадэвуш» пад назвай Святыня Задумы?

У сярэдзіне камень шарэў, з-пад якога крыніца
бруіла, шумела і зараз старалася скрыцца
ў цень між высокага зелля буйной гушчынёю,
якое тут добра расло, бо паілася вадою;
...Прыгожае месца, й чуваць толькі мілыя шумы:
Тальмена назвала то месца Святыняй Задумы.

(А. Міцкевіч. «Пан Тадэвуш».
Пераклад Б. Тарашкевіча).

Апошні раз А. Міцкевіч наведаў Туганавічы ў жніўні 1821 г. Марыля яшчэ да сустрэчы з Адамам была заручана з графам Ваўрынцам Путкамерам і не магла ўжо адмовіцца ад дадзенага яму слова і пайсці супраць волі сям'і. 2 лютага 1821 г. у Туганавічах яна ўступіла ў шлюб з Путкамерам. Старая ліпавая «альтанка», дванаццаць высаджаных у круг ліп, і сёння нагадвае нам аб месцы развітання Адама і Марылі.

Альтанка! Шчасця майго калыбель і магіла!
Тут спаткаўся, тут і развітаўся...

(А. Міцкевіч. «Дзяды»)

Глыбіню пачуццяў паэта да Марылі адлюстроўваюць ягоныя лісты. «Каханая Марыя, я цябе шаную і абагатвараю як нябеснае стварэнне. Каханне маё такое нявіннае і боскае, як яго прадмет... Ты мой анёл — захавальнік усюды прысутны. Асцерагаюся, каб нават у думках не пак-

рыўдзіць цябе...» (з ліста А. Міцкевіча да М. Путкамер ад 17 кастрычніка 1822 г.). 4 студзеня 1832 г. у лісце да Ігната Дамейкі Адам Міцкевіч піша: «Твой ліст даўнейшы, смутны, атрымаў у Рыме. Было там колькі слоў ад Марыі. Від яе рукі прывёў мяне ў такое захапленне, што я плакаў як дзіця, гэта быў першы мой плач пасля развітання з Чачотам і Занам. Мы ніколі ўжо не сустрэнемся. Але скажы Ёй, што яна заўсёды займае ў маім сэрцы такое месца, з каторага Яе ніхто ніколі не адсуне і дзе Яе ніхто не заменіць».

АПОШНІЯ ГАСПАДАРЫ


Пасля ад'езду Міцкевіча з Туганавіч маёнтак нядоўга заставаўся ў Верашчакаў. Восенню 1821 г. Марыя пераехала жыць у маёнтак мужа Бальценікі (цяпер Воранаўскі раён Гродзенскай вобласці) і Туганавічы наведвала вельмі рэдка. Міхал Верашчака па тэстаменту бацькі атрымаў суседні фальварак Плужыны і жыў там, займаючы пасаду старшыні Наваградскага павятовага межавога суда. Юзаф, як і некалі раней яго бацька, стаў маршалкам Наваградскага павета. За сумленную службу ў 1825 г. ён быў узнагароджаны ордэнам святога Уладзіміра IV ступені. У 1831 г. Юзаф ажыццяўляе абмен Туганавіч на маёнтак Смольчыцы Наваградскага павета, які належаў Яну Туганоўскаму, нашчадку колішніх уладальнікаў двара. Кола гісторыі замыкалася. Яна распарадзілася так, што адны з першых уладальнікаў Туганавіч сталі апошнімі гаспадарамі маёнтка. У 1844 г. уладальнікам маёнтка становіцца пляменнік Яна Канстанцін. Тады ў склад двара ўваходзіла

79 сялянскіх гаспадарак, у якіх налічвалася 46 валоў, 171 карова, 53 авечкі, 357 свіней, 209 вулляў з пчоламі.

Зямельныя ўладанні маёнтка ахоплівалі 274 маргі сядзібнай зямлі, 1953 маргі worыўнай, 309 маргоў сенажацяў і 308 маргоў знаходзілася пад лясамі.

Канстанцін Туганоўскі да прыезду ў Туганавічы скончыў Віленскі універсітэт і працаваў гродзенскім губернскім сакратаром. Яго жонкай была Зоф'я Верашчакава, дачка Юзафа і пляменніца Марылі. Канстанцін з'яўляўся сапраўдным патрыётам сваёй зямлі. Ён разумеў, што валодае гістарычнай мясцінай і клапаціўся аб яе належным стане. Хутка пасля ўступлення ва ўладанне маёнткам у 1848 г. К. Туганоўскі спрабаваў пабудаваць на мясцовых могілках капліцу ў гонар сваіх продкаў. Але яго высакародныя намеры сустрэлі нязгоду праваслаўнага духавенства і не былі здзейснены. У архіўных справах захаваўся праект капліцы, якая магла б упрыгожыць Туганавічы. У 1860 г. К. Туганоўскі паставіў бюст А. Міцкевіча ў «альтанцы». Ён старанна даглядаў бярозу, якую па паданню пасадзіў паэт на адным з узгоркаў у парку. У 1861 г. Туганавічы наведаў сын Адама Уладзіслаў.

Многія жыхары Навагрудчыны прымалі актыўны ўдзел у вызваленчым паўстанні 1863—1864 гг. на Беларусі, Літве і Польшчы супраць царызму. К. Туганоўскі быў абраны акруговым начальнікам паўстанцаў. У ягоным маёнтку дзейнічала майстэрня па вытворчасці зброі. У 1864 г. К. Туганоўскага арыштавалі і кінулі ў віленскую вязніцу, дзе ён і памёр падчас следства. Нешчаслівы лёс выпаў і на іншых членаў сям'і. Яшчэ ў



(6690)

Altana w ogrodzie w Tuhanowiczach.

«Альтанка» ў туганавіцкім парку
(малюнак другой паловы XIX ст.)

дзяцінстве памёрла дачка Канстанціна Марыя. У 1879 г. памірае Зоф'я, у 1881 г. — 18-гадовая дачка Ядвіга, у 1822 г. — яе 23-гадовая сястра Канстанцыя (па мужу — Цывіньская), а праз некалькі месяцаў — 3-гадовая дачка Канстанцыі Зося. Маёнтак перайшоў да чацвёртай дачкі Канстанціна і Зоф'і Юзэфы, якая і стала апошняй уладальніцай Туганавіч. Як і яе бацька, Юзэфа прыкладала шмат намаганняў для захавання памятных мясцін сядзібы. Пры ёй тут з'явіліся мемарыяльныя дошкі, даглядаліся парк, жылыя і гаспадарчыя будынкі. У сядзібным доме размяшчалася бібліятэка, збор твораў жывапісу, нумізматычная калекцыя, беражліва захоўваліся два томікі паэзіі А. Міцкевіча з аўтографамі аўтара і некаторыя асабістыя рэчы Марылі. У канцы XIX — пачатку XX ст. Туганавічы штогод наведвалі сотні людзей. Перад першай сусветнай вайной тут яшчэ існавалі «мураванка», сядзібны дом, аранжарэя, капліца з магіламі Верашчакаў, Туганоўскіх, Цывіньскіх і іншых мясцовых шляхціцаў. Вабіў сваёй прыгажосцю пейзажны парк з алеямі грабаў, ліп, клёнаў, ясеняў, дубоў. Ён займаў плошчу каля 5 га. Але ў 1915 г. Туганавічы апынуліся якраз на лініі расійска-германскага фронту. Тэрыторыя маёнтка была скапана акопамі і бліндажамі, многія з векавых дрэў парка высечаны, а ад будынкаў засталіся адны руіны. Юзэфе Туганоўскай ужо не стала сіл аднавіць маёнтак. Аднак да апошніх дзён жыцця яна марыла аб адраджэнні Туганавіч. У тэстаменце яна завяшчала Туганавічы дзяржаве і прасіла аб адкрыцці тут доследнай станцыі і земляробчай школы. За заслугі перад дзяржавай Юзэфа Туганоўская ўзнагароджана ордэнам «Polonia Restituta». Незадоўга перад смерцю ўладальніцы



Brzoza Mickiewicza w Tuhanowiczach.

Бяроза Адама Міцкевіча ў туганавіцкім парку (малюнак другой паловы XIX ст.)

маёнтка яе наведаў прэзідэнт Польшчы. У 1930 г. апошняя з Туганоўскіх памерла ў адзіноце ў сваім лясным фальварку Новы Свет і знайшла вечны спакой на варанчанскіх могілках.

ЗАКЛЮЧЭННЕ

На такой сумнай ноце не хацелася б заканчваць нашу гісторыю. Туганавічы не павінны кануць у вечнасць, як сотні іншых двароў на Беларусі. Яны заслугоўваюць лепшай долі. Лёс аказаўся несправядлівым да гэтай мясціны і сёння яна знаходзіцца ў запусценні. Але адраджэнне Туганавіч яшчэ магчымае. Захаваліся цікавыя гістарычныя дакументы ў архівах, апісанні маёнтка людзьмі, якія наведвалі яго ў XIX — пачатку XX ст., шматлікія малюнкі і фотаздымкі. Яшчэ захаваліся рэшткі колішняга пейзажнага парка. Шмат каштоўных матэрыялаў могуць прынесці далейшыя археалагічныя даследаванні ў Туганавічах. Усё гэта стварае ўмовы для аднаўлення сядзібы. Безумоўна, што наперадзе чакае нялёгкая праца. Але ў розных краінах, у тым ліку і ў нашых бліжэйшых суседзяў, назапашаны ўжо немалы вопыт па рэстаўрацыі сядзібных комплексаў. Прыгадайма хаця б Пушкінскі запаведнік у Пскоўскай вобласці. Сумесныя намаганні гісторыкаў, археолагаў, архітэктараў, спецыялістаў садова-паркавага мастацтва і ўсіх, хто шануе мінулае сваёй зямлі, павінны даць новае нараджэнне Туганавічам.

ЛІТАРАТУРА

Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею для разбора древних актов. Вильно, 1888. Т. 15.

Гурина Н. Н. Новые данные о каменном веке северо-западной Белоруссии // Палеолит и неолит СССР: Материалы и исследования по археологии СССР. М., Л., 1965. Т. 5. № 131.

Нацыянальны архіў РБ, ф. 1319, воп. 2, спр. 3299;
ф. 1333, воп. 9, спр. 148;
ф. 1730, воп. 1, спр. 43;
ф. 1770, воп. 1, спр. 30;
ф. 1774, воп. 1, спр. 11

Описание документов и бумаг, хранящихся в Московском Архиве Министерства Юстиции. М., 1915. Кн. 21. С. 45.

Русская историческая библиотека. СПб., 1903. Т. 20. С. 637—639.

Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. 2. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie. Wrocław — Warszawa — Kraków, 1992. S. 387.

Dernałowicz M., Kostenicz K., Makowiecka Z. Kronika życia i twórczości Mickiewicza. Lata 1798—1824. Warszawa, 1957. S. 238—240.

I...z. Tuhanowicze. Brzoza Mickiewicza i Altana // Kłosy. 1883. T. 37. № 960. S. 326—327.

Kodeks dypłomatyczny katedry i diecezji Wileńskiej. Kraków, 1948. T. 1.

Księga pamiątkowa na uczczenie setnej rocznicy urodzin Adama Mickiewicza (1798—1898). Warszawa, 1898. T. 2.

Nowogródzkie. Warszawa, 1926. S. 24—25.

Podhorski-Okołow L. Realia mickiewiczowskie. Cz. 2. Wpądam do Soplicowa. Warszawa, 1955. S. 10.

Ś lizien O. Z pamiętnika (1821—1824) // Z fiłareckiego świata. Warszawa, 1924. S. 120.

Wolff I. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca czternastego wieku. Warszawa, 1895. S. 233.

Wolff I. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego. 1386—1795. Kraków, 1885. S. 85.

Змест

Уступ 3
Пачаткі гісторыі 5
Дакументы сведчаць 9
У часы Міцкевіча 27
Апошнія гаспадары 41
Заключэнне 46
Літаратура 47

Навукова-папулярнае выданне

ШАБЛЮК Валерый Уладзіміравіч

ДВОР У ТУГАНАВІЧАХ

Загадчык рэдакцыі А. І. Саламевіч
Рэдактар М. А. Клябанава
Мастацкі рэдактар Л. І. Мялоў
Тэхнічны рэдактар М. І. Ванкевіч
Карэктар Л. А. Адамовіч

Набор і вёрстка выкананы на камп'ютэрнай тэхніцы выдавецтва «Полымя». Падпісана ў друк з арыг.-макета 18.10.95. Фармат 70 × 100 1/32. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 1,93. Ум. фарб.-адб. 2.11. Ул.- выд. арк. 1,55. Выд. № 9315. Зак. 5713

Выдавецтва «Полымя» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 432. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11

Друкарня "Перамога". 222310, Маладзечна, У. Таўлая, 11